ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
30 КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 28 (1292)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

«Беларускі універсітэт» ТЭЛЕТАЙП

## ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ

савета прафілактыкі праваПарушэнняў праведзены агульнауніверсітэцкі семінар на тэму «Прафілактыка — асноўнае звяно ў барацьбе з раскраданнем дзяржаўнай маёмасці, безгаспадарчасцю і марнатраўствам». На яго былі запрошаны дэканы факультэтаў, загадчыкі аддзелаў і кіраўнікі іншых структурных падраздзяленняў, работнікі бугалтэрыі, матэрыяльна-адказныя асобы.

Прысутныя праслухалі даклады прафесараў А. В. Дулава і І. С. Цішкевіча і старшага выкладчыка Я. М. Ануфрыева. Вёў семінар прарэктар па вучэбнай рабоце В. Г. Ціхіня.

А. ГЕРМАНОВІЧ.

## КАФЕДРАЛЬНАЯ СІСТЭМА

камсамольскай арганізацыі, вопыт работы якой ужо ёсць на некаторых факультэтах, будзе дзейнічаць на факультэце прыкладной матэматыкі. На пасяджэнні камітэта камсамола ФПМ вырашана з усіх вучэбных груп, якія спецыялізуюцца на адпаведных кафедрах, стварыць адну камсамольскую арганізацыю, каб наладзіць больш цеснае знаёмства студэнтаў з кафедрамі і такім чынам правесці размеркаванне не толькі адміністратыўна, а і па інтарэсах.

С. КАНОВА.

## СТУДЭНЦКІ КІНАУНІВЕРСІТЭТ

«Кіно і час» пачаў сваю работу. Адбылася сустрэча з заслужаным артыстам РСФСР Уладзімірам Заманскім. Гледачы добра ведаюць яго як выканаўцу галоўных ролей у мастацкіх фільмах «Інспектар крымінальнага вышуку», «Фронт без флангаў», «Кропка, кропка, коска...», «Адзіная», «Права на скачок» і інш. Вядомы акцёр расказаў аб сваёй рабоце ў кіно, падзяліўся творчымі планамі на будучае. У заключэнне дэманстраваўся фільм «Наш дом сёння».

На наступных занятках кінауніверсітэта адбудзецца сустрэча з доктарам філасофскіх навук, супрацоўнікам інстытута ЗША і Канады А. Е. Кокаравым, які выступіць перад слухачамі з лекцыяй «Захад: кіно і моладзь».

А. ВЯТРОЎ.

## ЗАКАНЧВАЮЦЦА СПРАВАЗДАЧЫ

і выбары ў пярвічных прафсаюзных арганізацыях універсітэта. Выбіраецца новы састаў прафбюро, ідзе ўпарадкаванне структуры арганізацый. На сходах вырашаюцца пытанні ўзмацнення ролі прафгрупы, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, паляпшэння ўмоў працы і быту.

І. БАРДЗІЯН.

З НАШАЙ ПОШТЫ

## «Мая радзіма—свабодная краіна»

ДЛЯ ЖЫЦЦЯ йеменскага народа, для рэвалюцыі вельмі важнае значэнне мае рашэнне эканамічнай праблемы.

Волю самых шырокіх мас выразіла наша дзяржава, калі павяла барацьбу за ўмацаванне палітычнай незалежнасці. Ва ўмовах новых адносін вырастаюць дзяржгасы і кааператывы. Працоўныя фабрык і заводаў самі вядуць кантроль над вытворчасцю з мэтай забеспячэння эканамічнага росту.

Тэарэтычная аснова нашай рэвалюцыі і нашага ладу — ідэі навуковага сацыялізму, на якія мы абапіраемся ва ўсёй сваёй палітыцы.

Йеменская сацыялістычная партыя іграе вялікую ролю ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Вопыт мінулых гадоў пацвердзіў волю і рашучасць здольнасць нашага народа здзяйсняць рэвалюцыйныя пераўтварэнні.

Касім АХМЕД,
студэнт II курса
факультэта журналістыкі.

## «Адказнасць быць інтэрнацыяналістам»

У ЧАРГОВЫ РАЗ факультэт журналістыкі прыняў замежных студэнтаў. З самага пачатку тут навучалася 19 чалавек, а цяпер на нашым III курсе з першага набору засталося 17 чалавек. Мы прыехалі з 12 краін, 4 кантынентаў. Займацца нам вельмі падабаецца, але некаторыя са студэнтаў яшчэ дрэнна ставяцца да вучобы: прапускаюць заняткі, не рыхтуюцца да іх. Трэба аб гэтым падумаць сур'ёзна, бо вучыцца ў Савецкім Саюзе, быць інтэрнацыяналістам — гэта да многага абавязвае.

Амар ВАЛАТО,
студэнт III курса
факультэта журналістыкі.

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ!**

**БУДЗЬЦЕ СВЯДОМЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА КАМУНІЗМ!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 63-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).*

## «Сталі сябрамі...»

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ я займаюся другі год. Разам са мной на вучобу ў Беларусь прыехала многа студэнтаў з Йемена. На час вучобы Мінск стаў для нас другім домам.

Факультэт жа пазнаёміў і падружыў з юнакамі і дзяўчатамі з многіх краін свету. Вучоба, жыццё ў студэнцкім інтэрнаце з'ядналі ў адну сям'ю маладых людзей Савецкага Саюза, Йемена, Афганістана, В'етнама, Сірыі, Палесціны, Мадагаскара і інш. Вельмі важна для нас, замежных студэнтаў, тая дапамога, клопат, які нам аказваюць выкладчыкі і студэнты з Савецкага Саюза. Яны сталі нашымі вялікімі сябрамі. Дзякуючы сяброўству, узаемаразуменню паміж моладдзю цікавым стала жыццё на факультэце.

Мы рады, што нам прадастаўлена магчымасць вучыцца на зямлі Леніна, у першай краіне сацыялізму; рады, што атрымаем веды паслужаць росквіту нашай Радзімы.

Саід МАМАРЫ,
студэнт II курса
факультэта журналістыкі.



Студэнты кафедры фізікі паўправаднікоў па выніках навукова-даследчай работы ўпэўнена займаюць першае месца на фізічным факультэце.

НА ЗДЫМКУ: ідуць лабараторныя работы.

Фота А. СТАДУБА.

НАСУСТРАЧ XXVI З'ЕЗДУ КПСС

## Актывізавалі дзейнасць

АСНОЎНЫМІ ФОРМАМІ падрыхтоўкі навуковых і навукова-педагагічных кадраў з'яўляецца аспірантура, спаборніцтва на атрыманне вучоных ступеней, залічэнне на пасады стажораў-выкладчыкаў.

У аспірантуры універсітэта навучаецца 564 аспіранты па 78 навуковых спецыяльнасцях.

Навуковае кіраўніцтва аспірантамі здзяйсняюць 259 навуковых кіраўнікоў, з іх 11 дактароў навук, прафесараў.

Да кафедр універсітэта замацавана ў якасці спаборнікаў на атрыманне вучоных ступеней 573 чалавекі, з іх 74 працэнты — выкладчыкі ВНУ, навуковыя работнікі і вучэбна-дапаможны персанал ВНУ краіны.

Аддзел аспірантуры сумесна з факультэтамі і кафедрамі універсітэта праводзіць арганізацыйную работу па выкананню планаў прыёму ў аспірантуру, планаванню тэматыкі дысертацыйных работ аспірантаў, забеспячэнню кваліфікаванага навуковага кіраўніцтва, здзяйсненню кантролю за выкананнем аспірантамі індывідуальных планаў, арганізацыі вучэбнага працэсу.

Выклікае занепакоенасць той факт, што працэнт аспірантаў, якія заканчваюць навучанне ў аспірантуры з абаронай кандыдацкіх дысертацый, застаецца ўсё яшчэ нізкім. Так, у 1979 годзе агульная колькасць паспяхова скончыўшых аспірантуру склала 53,5 працэнта, а лік аспірантаў, абараніўшых кандыдацкія дысертацыі ў тэрмін навучання, склаў усяго 5 працэнтаў.

Ідучы насустрач XXVI з'езду КПСС, мы запланавалі шэраг мерапрыемстваў, якія павінны актывізаваць работу аспірантуры ў цэлым і павысіць эфектыўнасць падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў кафедрамі універсітэта.

Прадугледжваецца сістэматычна аналізаваць работу навуковых кіраўнікоў аспірантаў, заслухоўваць на саветах факультэтаў і савеце па грамадскіх навуках справаздачы навуковых кіраўнікоў і аспірантаў, якія не завяршылі дысертацыйныя работы ў тэрмін. Тэматыка дысертацыйных работ аспірантаў будзе прыводзіцца ў строгую адпаведнасць з тэматычным планам НДР і асноўнымі навуковымі напрамкамі універсітэта.

У 1980-81 навучальным годзе адбудзецца субяседаванне аспірантаў 2 і 3 года навучання і іх навуковых кіраўнікоў з прарэктарам па навуковай рабоце з мэтай забеспячэння паспяховага заканчэння аспірантуры.

Навуковым кіраўнікам аспірантаў, загадчыкам кафедр, дэканам факультэтаў неабходна больш прынцыпова падыходзіць да атэстацыі аспірантаў, своечасова ўказваць на недапрацоўкі ў выкананні плана, прад'яўляць высокую патрабавальнасць і прынцыповасць да работы аспірантаў.

Л. ЯНОЎСКАЯ,
загадчык аддзела
аспірантуры.

# ЦЕННЫЕ НАЧИНАНИЯ

ВКЛЮЧИВШИСЬ в выполнение решений июльского (1980 г.) Пленума ЦК КПСС, требований постановления ЦК КПСС «О развертывании социалистического соревнования за достойную встречу XXVI съезда КПСС», народные контролеры ПО «Минмедпрепараты», МПОО «Луч» и кожгалантерейной фабрики им. В. В. Куйбышева выступили с рядом начинаний, свидетельствующих об их глубокой заинтересованности в изыскании новых возможностей и резервов повышения эффективности производства и качества работы, усилении контроля за использованием материальных и трудовых ресурсов, обеспечении строжайшего режима экономии.

Рассматривая как один из важных резервов строгое соблюдение режима экономии топливно-энергетических ресурсов, а также своевременную и высококачественную подготовку предприятий, учреждений и организаций района к осенне-зимнему периоду 1980-81 года, органы народного контроля Московского района определили своей главнейшей задачей оказание помощи трудовым коллективам в получении во втором полугодии 1980 года экономии не менее 1,6 миллиона квт. часов электрической, 7 тысяч гкал. тепловой энергии. Решение этой важной народнохозяйственной проблемы находится под постоянным контролем.

Так, народные контролеры ПО «Минмедпрепараты» обязались путем изыскания дополнительных возможностей и резервов содействовать экономии на предприятии во втором полугодии не менее 600 тысяч квт. часов тепловой энергии и не менее 190 тонн условного топлива.

Народные контролеры объединения взяли под свой контроль такой важный вопрос, как досрочный ввод в эксплуатацию оборудования по производству рифампицина на сумму 150 тысяч рублей.

Опираясь на инициативу дозорных, группы народного контроля Московского района оказывают помощь трудовым коллективам в досрочном выполнении плана 1980 года по объему реализации продукции и выпуску большинства важнейших видов изделий. Дозорные установили постоянный контроль за рациональным использованием рабочего времени, сырья и материалов, совершенствованием организации производства и труда.

Группа народного контроля Минской кожгалантерейной фабрики им. В. В. Куйбышева взяла под особый контроль вопросы повышения качества продукции, увеличения выпуска изделий с государственным Знаком качества.

Народные контролеры МПОО «Луч», активно участвуя в подготовке к XXVI съезду КПСС, контролируют вопросы дальнейшего увеличения выпуска продукции в ассортименте, соответствующем современному спросу населения.

С ценными инициативами по достойной встрече XXVI съезда КПСС выступили и другие группы народного контроля района.

**Л. МАЦКО,**
**председатель комитета НК Московского района.**

# НК СТРАНИЦА № 9 КОМИТЕТА НАРОДНОГО КОНТРОЛЯ МОСКОВСКОГО РАЙОНА

## НА СМОТРЕ—СРЕДСТВА ГЛАСНОСТИ

**ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ о проведении городского смотра средств гласности органов народного контроля и отрядов «Комсомольского прожектора».**

**Смотр проводится с целью дальнейшего совершенствования народного контроля, повышения его действенности. Особое внимание будет обращено на обобщение и внедрение действенных форм и методов проведения проверок, рейдов, предупреждение и устранение недостатков.**

## ПРОВЕРКОЙ УСТАНОВЛЕНО...

ПРОВЕРКОЙ УСТАНОВЛЕНО, что на промышленных предприятиях района проводится определенная работа по подготовке к осенне-зимнему периоду, повышению эффективности использования и экономии топливно-энергетических ресурсов.

Вместе с тем, на головном предприятии Минского производственного объединения реммехпредприятий Минпищепрома БССР (заместитель генерального директора В. Д. Чертович) в этой работе имеются существенные недостатки. Здесь отсутствует положение о премировании за экономию энергоресурсов, не разработаны мероприятия по экономному расходованию энергоресурсов.

Проверка технического состояния изоляции проводов и заземления электрооборудования на предприятии в 1980 году не проведена. Не ведется журнал учета периодического приема экзаменов по технике безопасности у работников энергослужбы.

Отсутствует наглядная агитация по вопросам экономии и эффективного использования энергоресурсов.

Существенные недостатки имеются в вопросах использования автотранспорта, хранения горюче-смазочных материалов.

Анализ работы автотранспорта в целях повышения эффективности его использования и экономии горюче-смазочных материалов не проводится. Имеют место значительные безгрузовые пробеги автомашин.

Нарушаются правила хранения горюче-смазочных материалов и правила противопожарной безопасности. Территория склада горюче-смазочных материалов не ограждена. Емкости не окрашены, грунт на территории склада пропитан маслами и горючим, очистка его не производится.

Единственный противопожарный щит разукомплектован. Правилам пользования огнетушителями работники склада не обучены.

За все указанные недостатки руководители предприятия наказаны.

**В. ЧИЖЕВСКИЙ,**
**внештатный инспектор РК НК.**

## ЗА ВИДИМЫМ БЛАГОПОЛУЧИЕМ

НАРОДНЫЕ КОНТРОЛЕРЫ проверили деятельность института «Белгипроторг» (директор В. Н. Аладов, главный инженер В. М. Лапцевич, начальник планово-производственного отдела Н. Я. Булдык, главный бухгалтер Л. А. Будинская) и отметили серьезные недостатки в планировании. Планы неоднократно корректируются, что не способствует ритмичной работе и своевременному выпуску проектно-сметной документации.

Руководство института в целях создания видимости благополучия стало на путь очковтирательства и приписок.

В отчет о выполнении плана включались объекты, работы по которым производились позже официального срока передачи документации заказчикам.

Всего выборочной проверкой выявлено приписок во II квартале 1979 года на сумму 13,7 тысячи рублей, в III квартале 1979 года—51,5 тысячи рублей. В результате приписок незаконно выплачены премии по итогам работы за II квартал 1979 года 16,5 тысячи рублей, за III квартал 1979 года — 15,6 тысячи рублей.

Из-за низкого уровня организации планирования, несвоевременной и некомплектной выдачи проектной документации институт работает крайне неритмично. Большинство объектов выпускается, как правило, в последнем месяце квартала. Такая неравномерная загрузка приводит к штурмовщине и в конечном итоге к снижению качества проектов.

За указанные нарушения директор и главный инженер института освобождены от занимаемых должностей.

**Б. МЕЛЬНИКОВ,**
**инспектор РК НК.**

## ВНИМАНИЕ ШКОЛАМ

ПРИСТАЛЬНОЕ ВНИМАНИЕ уделяют народные контролеры работе общеобразовательных школ. Они оперативно вскрывают имеющиеся недостатки, помогают их устранять. Так, недавно был проведен рейд, в ходе которого выявлено, что в некоторых школах текущий ремонт проведен некачественно.

Не полностью произведен ремонт канализационных систем и сантехнического оборудования.

Не произведена ревизия и ремонт вентиляционных систем в учебных помещениях, пищеблоках и санузлах СШ №№ 3, 60, 80, 83, 101.

Не доведено до норматива искусственное освещение рабочих мест учащихся в кабинетах, учебных классах, спортзалах, мастерских СШ №№ 60, 101.

Оборудование кабинетов труда и мастерских ряда школ требует обновления.

Существенные недостатки допущены при подготовке к учебному году пищеблоков школ со стороны Московского треста столовых. В большинстве школ недостаточно столовой посуды и другого кухонного инвентаря. Не проведен текущий ремонт пищеблока, неисправно холодильное и технологическое оборудование в СШ № 60.

Районный отдел здравоохранения не полностью укомплектовал школы медицинским персоналом. В результате бракераж пищи проводится нерегулярно. Районная санэпидемстанция недостаточно осуществляет контроль за санитарным состоянием пищеблоков и помещений школ.

В ряде школ плохо используются технические средства обучения. Бездействуют лингафонные кабинеты, неисправна аппаратура в кабинете иностранных языков СШ № 83.

Допускаются в школах нарушения правил техники безопасности и противопожарной безопасности в результате неудовлетворительного хранения реактивов и других приборов.

Руководителям школ указано на эти недостатки и поручено принять необходимые меры для их устранения.

**В. ЛАРЮТИН,**
**внештатный инспектор РК НК.**

## ОПЯТЬ ПРОСТОИ...

ЗНАЧИТЕЛЬНАЯ РАБОТА проведена дозорными по повышению эффективности использования железнодорожных вагонов, сокращению их простоев под грузовыми операциями.

Вместе с тем руководители отдельных предприятий и организаций не уделяют еще должного внимания этому вопросу, в результате чего имеют место сверхнормативные простои вагонов.

За семь месяцев 1980 года предприятиями и организациями района, имеющими подъездные пути, задержано под погрузкой и выгрузкой сверх установленных норм времени 998 вагонов. Суммарный сверхнормативный простой составил 4163 вагоно-часа.

Не укладывается в установленные нормы простоя вагонов опытно-механический завод Минпромстройматериалов БССР (зам. директора И. А. Хмелевский). При норме простоя 1,5 часа вагоны простаивали свыше шести часов, что в четыре раза больше норматива.

За семь месяцев текущего года заводом задержано под грузовыми операциями 97 вагонов.

Резко ухудшилось использование железнодорожного транспорта на вагоноремонтном заводе имени Мясникова (зам. начальника А. Б. Гутин), имеются недостатки в работе по повышению эффективности использования железнодорожных вагонов в 1-й Минской областной конторе «Белбакалея» (зам. директора Я. Я. Шульга).

Районный комитет народного контроля рассмотрел этот вопрос на одном из своих заседаний и обязал руководство указанных предприятий ликвидировать все упущения.

**А. ПРИХОДЬКО,**
**внештатный инспектор РК НК.**





# САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

**Нататкі нашага спецыяльнага карэспандэнта С. ЛЫСКАЎЦА з першага фестывалю палітычнай песні моладзі і студэнтаў Беларускай ССР, які прайшоў нядаўна ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.**

**Фестываль чакалі. Да яго рыхтаваліся. І гаспадары, і госці. Ён сабраў лепшых, тых, хто прысвяціў сябе палітычнай песні. Жанру, які патрабуе самаадданасці, высокага выканаўчага майстэрства, палітычнай сталасці.**

**Палітычная песня не страціла сваёй актуальнасці. Яна жыве, пратэстуе і змагаецца, каб з нашай планеты знікла вайна, прыгнёт, фашызм, расізм. Яна — сумленне і голас прагрэсіўнай моладзі, трыбуна барацьбы. І першы фестываль палітычнай песні моладзі і студэнтаў Беларусі яскрава пацвердзіў гэта.**

## КОНКУРС

Ён быў вялікі. Строгаму і патрабавальнаму журы, якое ўзначаліў лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі кампазітар І. М. Лучанок, трэба было праслухаць 84 конкурсныя выступленні амаль 200 удзельнікаў. Праслухаць і ацаніць па наступных групах: вакальна-інструментальныя ансамблі, вакальныя групы і салісты. Задача, пагадзіцеся, складаная. І толькі ў апошні, трэці конкурсны дзень, канчаткова вызначыліся лаўрэаты фестывалю. Імі сталі:

**Сярод вакальных груп дыплом першай ступені і званне лаўрэата конкурсу атрымала трыо палітычнай песні БДУ імя У. І. Леніна ў саставе А. Зайцавай, А. Сідзякі і А. Бяловай. Другое месца па рашэнню журы не было прысуджана нікому. Дыпломам трэцяй ступені ўзнагароджаны квартэт з Мадагаскара ў саставе Марселя Разафі Філібера, Вільяма Фітахія, Жустэна Ракутудраі, Эжэна Ракутумамундзі.**

**Сярод вакальна - інструментальных ансамбляў дыплом І ступені і званне лаўрэата фестывалю рашэннем журы не прысуджалася. Званне лаўрэата і дыплом ІІ ступені атрымаў ВІА Мінскага інстытута культуры. Дыплом ІІІ ступені — у ВІА «Глобус».**

**Сярод вакалістаў званне лаўрэата і дыплом І ступені атрымалі адразу два ўдзельнікі конкурсу: Алег Ацьман, Уладзімір Васіленка (абодва студэнты БДУ). Званні лаўрэатаў і дыпломы ІІ ступені прысуджаны Аляксандру Чарных (г. Данецк) і студэнту Мінскага інстытута культуры Уладзіміру Кухціку. Дыпломам трэцяй ступені ўзнагароджаны Уладзімір Крывашэеў (Гродзенскі дзяржаўны універсітэт).**





Такі канчатковы вынік, такі фінал.

Не памылюся, калі скажу, што самым запамінальным, самым цікавым было выступленне трыо палітычнай песні Белдзяржуніверсітэта. Гэта цудоўны калектыў. Яго добра ведаюць не толькі ва універсітэце, але і далёка за яго межамі. Трыо ўдзельнічала і неаднаразова станавілася лаўрэатам шматлікіх рэспубліканскіх і усесаюзных конкурсаў палітычнай песні.

Прыемнай асаблівасцю фестывалю стаў удзел у ім замежных студэнтаў, якія вучацца зараз у Беларусі. Гэта квартэт з Мадагаскара, вакальная група «Чырвоныя макі» з Балгарыі, жыццярадасны калектыў з ГДР, які падрыхтаваў спецыяльна для фестывалю цэлую праграму пад агульнай назвай «Песня аб міры», квартэт з Чылі. На жаль, не прыехалі на фестываль запрошаныя госці з Масквы, Адэсы і іншых гарадоў краіны. Гэта, безумоўна, крыху збядніла агульную палітру конкурснай праграмы.

Цікавым і незвычайным па сваёй форме і ўнутранай сутнасці было выступленне студэнта ІІІ курса англійскага аддзялення рамана-германскага факультэта Данецкага дзяржаўнага універсітэта Андрэя Чарных. Яго прозвішча яшчэ не зусім вядома аматарам палітычнай песні ў нашай рэспубліцы, але зараз на Беларускім тэлебачанні рыхтуецца запіс яго конкурснага выступлення — аўтарскай песні «Мамаеў курган». Андрэю 20 год. Пасля заканчэння музычнай школы ў Адэсе яго накіравалі на стажыроўку ў Веймарскую вышэйшую школу музыкі на аддзяленне эстраднага вакалу і эстраднай кампазіцыі. У 1974 годзе ён удзельнічае ў выступленнях нямецкай рок-групы «Год нараджэння 1949». А праз два гады, калі ў Берліне адбыўся Х сусветны фестываль моладзі і студэнтаў, ён усур'ёз захапіўся палітычнай песняй.

Сярод вакальна-інструментальных ансамбляў высокім прафесійным майстэрствам вызначыўся калектыў Мінскага інстытута культуры. У яго роўнае, чыстае гучанне, добрая аранжыроўка і галоўнае — адчуванне адзінага цэлага. Гэтай якасцю валодалі, на жаль, не ўсе прадстаўленыя на конкурсе ВІА.

## СУСТРЭЧЫ

Іх было шмат. Самых розных. Бо ў праграме фестывалю палітычнай песні моладзі і студэнтаў Беларускай ССР былі не толькі конкурсныя выступленні. Прайшлі сустрэчы з рабочымі і служачымі мінскіх прадпрыемстваў, прагучалі канцэрты ў шпіталі ватэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Бараўлянах.

Запамінальнай для ўдзельнікаў фестывалю была размова з кампазітарам І. М. Лучанком. Вось што сказаў ён маладым выканаўцам:

— Палітычная песня—зброя. І зброя гэта павінна быць высокамастацкай, крыштальна чыстай.

Я ўспамінаю зараз 1974 год, калі разам з «Песнярамі» рабіў паездку па ЗША. Звычайныя амерыканцы, якія не ведалі мовы, на якой мы выконвалі свае песні, разумелі нас. Агульнавядомыя ў нас творы, там, у Амерыцы, ператварыліся ў палітычныя песні. Бо паняцце палітычная песня — гэта не абавязкова заклік, гэта і лірыка. Успомнім, напрыклад, нашу «Кацюшу»...

І ў заключэнне я заклікаю вас да добрага густу, да беражлівых адносін да палітычнай песні.

...Фестываль закончыўся. Закончыліся хваляванні яго ўдзельнікаў і арганізатараў. Дарэчы, аб арганізацыі фестывалю. Яна жадае быць лепшай.

Але галоўнае, што першы фестываль палітычнай песні моладзі і студэнтаў Беларусі адбыўся. І мы з нецярпеннем чакаем наступнага.



**НА ЗДЫМКАХ: удзельнікі фестывалю ў Хатыні; спявае У. Васіленка (БДУ); на сцэне А. Зайцава, А. Бялова, А. Сідзяка; гутарка з рабочымі станкабудаўнічага завода імя Кірава.**

**Фота А. СТАДУБА.**




# Памятайце імгненні

**МАНАЛОГ**

СПАЗНЯЕМСЯ. СПЯШАЕМСЯ. І чыйсьці знаёмы твар прамільгне ў натоўпе, а потым успамінаем: дзе яго бачыў? Школа, інстытут, пляж, чарга, размаўлялі?..

Міма плошчаў і вуліц, дзе ідуць, гуляюць людзі і дзеці!

Міма сяброў — гэта ехаць у суседнюю галактыку, размаўляць, а потым яшчэ папросяць чаго-небудзь.

Міма спрэчак — чорт з ёю, з іс-цінай.

Міма цудоўных вачэй той дзяўчыны, што сустрэлася ў трамваі. Ці ў аўтобусе?

Міма дзяцей — потым абавязкова!

Міма бацькоў — заўтра. Дакладней — паслязаўтра, і ўсё!

Міма грошай — усё роўна не хопіць.

Міма свайго гора — і так клапатаў хапае. Па горла!

Міма чужога шчасця — шанцуе ж людзям!

Міма свайго!

Таму што некалі?!

...Спазняемся на самалётах, у цягніках, на машынах, з апошніх сіл.

Міма вялікіх гарадоў, вёсак, дрэў, травы і людзей, выкурыўшы пачак цыгарэт у дзень.

Па панядзелках, па пятніцах, па лужах, па голай зямлі, праз дарогу бягом, на чырвоны свет, уперад!!!

А можа, спынімся?..

● ЗАМЕТКІ ФЕНОЛАГА

**Восенню ў дэканат выклікаюць студэнтаў за ўсё па панядзелках.**

● ХОБІ ПРАГРАМІСТА

Цікавае захапленне ў маладога прагараміста Х. Букава: на палове костачкі лімона ён цвіком напісаў усё, аб чым даведаўся ў інстытуце.

● КІНО

Звыш ста тысяч студэнтаў пераглядзеў вядомы рэжысёр Р. Кукін, перш чым знайшоў выканаўцу галоўнай ролі ў новым маладзёжным фільме — другакурсніцу Зінаіду Няхлюй. Зараз здымачны калектыў вырашае больш складаную задачу — як прабіць ёй стыпендыю.

## Хроніка

● СНЫ

**Выдатную адзнаку ў залікоўцы прысніў пазаўчора ноччу пяцікурснік А. Смазаў. Гэта ўжо сёмы па ліку сон, які ніяк не можа збыцца.**

● СКАРГ БУДЗЕ МЕНШ

Нарэшце ў інтэрнаце № 18 на самым бачным месцы паявілася кніга скаргаў. Яна знаходзіцца ў герметычнай скрыныі з браніраванага шкла. Пры малейшым дотыку да скрынкі ўключаецца гукавая сігналізацыя.

● У ДАПАМОГУ СТУДЭНТАМ

Вытворчым аб'яднаннем «Німфа» поўнасцю асвоены выпуск ЭВМ, якая за лічаныя хвіліны выдае 10 тысяч адказаў на экзаменацыйны білет. Студэнту толькі застаецца знайсці правільны.

● СТУДЭНЦКАЯ ГУЛЬНЯ

**Калі на першую клетачку шахматнай дошкі пакласці адну запалку, на другую — дзве, на трэцюю — чатыры, на чацвёртую — восем і гэтак далей, кожны раз падвойваючы колькасць запалак, то лекцыя праляціць вельмі хутка.**

— ВОСЬ МАЯ ЗАЛІКОЎКА. Я прыйшоў на экзамен. Дайце мне білет.

— Пачакайце, а хто вы такі?

— Я Пятроў, вось мая залікоўка, я прыйшоў на экзамен. Дайце мне білет.

— Згаварыліся.

— Мяне паважаюць.

— Падкупілі.

— А хто ж я такі, па-вашаму?

— Вы... вы забойца!

— Я забойца?

● ПАРОДЫІ



## ЗАБОЙЦА

— Я бачу, што гэта залікоўка. Але чым вы мне дакажаце, што яна ваша?

— Я Пятроў, мяне тут усе ведаюць. Дайце мне білет.

— Не, вы не студэнт Пятроў. Я вас на сваіх лекцыях не бачыў. Вы чалавек з вуліцы.

— Я не студэнт Пятроў!? Вось мая фотакартка ў залікоўцы, параўнайце, параўнайце!

— А чым вы дакажаце, што фотакартка ваша, га?

— А вы параўнайце, параўнайце. Бачыце?

— Я нічога не бачу. Чым вы дакажаце, што вы студэнт Пятроў?

— А чым вы дакажаце, што вы Сідараў — прафесар, га?

— Я... я Сідараў — прафесар. Выкладаю трынаццаць гадоў.

— Не веру.

— Мяне кожны ў інстытуце ведае.

— Так. Вы злавілі Сідарава-прафесара, забілі яго, адабралі ў яго ведамасці, прыйшлі ў гэту аўдыторыю і селі...

— Што за бязглуздзіца. Я Сідараў — прафесар. Я прымаю зараз экзамен. Спытайце ва ўсіх.

— Вы не Сідараў-прафесар; вы забойца. Нават кроў не паспелі сцерці.

— Дзе?

— Вось, у ведамасці, пагляд зіце, гэта кроў? Навошта вы яго забілі?

— Я ў жыцці нікога не забіваў. Я Сідараў — прафесар, а гэта чырвоны аловак.

— Не. Гэта кроў. Ідзі ад мяне, забойца!

— Што вам ад мяне патрэбна? Адчапіцеся! Вось ваша залікоўка, цягніце білет і рыхтуйцеся.

— Не буду. Я ўсім раскажу, хто вы такі...

## МАСТАКІ ПРА СЯБЕ





**За ўсе прыведзеныя вышэй факты нясе поўную адказнасць дзяжурны па кафедры Н. Яробкін.**

**М. ДУБОВІК**

# НАТАШКА-ТАЕЖНІЦА

**(Заканчэнне. Пачатак у № 27).**

— А ў Мінску іх няма.

Кузя назіраў за Наташкай-таежніцай і міжволі перастаў думаць аб паломцы матацыкла, аб тым, што, хутчэй за ўсё, прыйдзецца волакам цягнуць яго ў «стойбішча». Яму проста хацелася нават гаварыць з малой, слухаць яе наіўнае дзіцячае шчабятанне. Наташка не была падобна на сваіх сталічных аднагодкаў. Нейкая недзіцячая разважлівасць чулася ў яе голасе, самастойнасць, спачуванне незнаёмаму чалавеку.

Па ўсяму яе выгляду было відаць, што гэтая малая таежніца не сумуе, што ў пасёлку няма таго, што ёсць у Мінску. З гонарам гаворыць пра свае ўсюдыходы, паязды, БАМ.

— А ў Мінску і тайгі, мабыць, няма?

— Няма, Наташка.

— І столькі ягад і журавін няма?

— Няма.

— І шышак кедравых няма?

Кузя моўчкі паківаў галавою.

— Зусім нецікава, — адказала малая. — Як гэта — без тайгі і шышак?! А кветак тут колькі!

У дзяўчынкі аж разгарэліся вочкі.

— Я маме заўжды збіраю іх, калі яна з работы вяртаецца. Не так сумна.

— Наташка!..

Малая паварочваецца на вокліч Кузі, і яе шэрыя вочкі з цікавасцю глядзяць на хлопца.

— А чаму цябе так назвалі — таежніца?

Дзяўчынка ўсміхаецца.

— Дык гэта тата з мамаю.

З зусім сур'ёзным выглядам яна пачынае тлумачыць:

— У тайзе ж буслоў няма. Вельмі ім далёка ляцець, каб прынесці малых дзетак сюды. Вось тата аднойчы паехаў і знайшоў мяне на сопцы. Таму я і таежніца.

Але, відаць, малой не дужа цікава расказваць пра сваё паходжанне, і яна зноў звяртаецца з пытаннем да Кузі:

— А ў Мінску і сопак няма?

— Няма.

— Зусім нецікава.

— Затое ў Мінску ёсць каруселі, мядзведзі лялечныя, зайцы, чабурашкі.

— А ў нас таксама ёсць мядзведзі і зайцы, толькі сапраўдныя. Праўда, чабурашак няма. Затое ў нас будзе хутка горад-сад, — з гонарам кажа малая. — Мы з татам і мамкай будзем тут гуляць. У садзе будуць і каруселі, і ўсялякія лялькі, і марожанае, і чабурашкі, і... — яна ўважліва пагляд зела на мяне і ўпэўнена сказала:

— І свае «МАЗы». Так?

— Так, так, Наташка, будуць.

— І мы будзем з татам катацца на каруселях, «МАЗах» і матацыклах.

— А ты хочаш пакатацца?

— Але, — малая кіўнула галавою, — ды ў нас няма каруселяў.

— А на матацыкле хочаш?

— А ў вас ёсць матацыкл?

— Ёсць, толькі нешта не заводзіцца.

— А ў майго таты таксама не заводзіўся. Дык ён гэта, — тут дзяўчо прыжмурылася, прыпамінаючы, што рабіў тата, калі не заводзіўся матацыкл.

— Во, успомніла. Трэба бінзін падкачаць і гэтыя, што токам б'юцца, уключаюцца ў матацыклах.

Тут Кузя падумаў, што Наташка і ён аднолькава разбіраюцца ў матацыклах.

— Ну, пайшлі, паспрабуем.

Яны крочылі да матацыкла, ззаду бег шчанюк, а Наташка усё гаварыла пра тайгу, пра машыны, пра горад-сад, які хутка закрасуе сярод сопак. Кузьма Іванавіч верыў цвёрда і ўпэўнена ў адрозненне ад бясхітрасных, але правільных дзіцячых думак Наташкі, што тут будзе абавязкова горад-сад, збудаваны рукамі такіх адданых сваёй справе людзей, як Наташкіны бацькі, як тысячы юнакоў і дзяўчат, што прыехалі на будоўлю, як Кузіны сябры-студэнты. І што ў мірным небе будзе кружыцца птушка-шчасця — бусел.

Кузьма Іванавіч падкачаў «бінзін», праверыў клемы акумулятара, націснуў з сілай педаль.

І о! — дзіва! Рухавік адразу завёўся, к вялікай радасці Кузі, Наташкі і шчанюка, які аж забрахаў, радасна скачучы вакол матацыкла.

— Ну, Наташка, трымайся, паедзем!..

— У горад-сад?

— Але. У горад-сад. Вуліцы ж у нас пракладзены.

...! Кузьма Іванавіч павольна выехаў счапленне.

# РАЯЦЬ УРАЧЫ

**ЗАХВОРВАННЕ** грыпам сярод насельніцтва ў горадзе Мінску застаецца высокім. За апошнія 10 гадоў было зарэгістравана восем эпідэмій грыпу. Таму барацьба з гэтым захворваннем — адна з актуальных задач сучаснасці.

У цяперашні час распрацаваны новы комплексны метад абароны насельніцтва ад грыпу, у аснову якога ўваходзіць укараненне ў практыку новых супрацьгрыпозных прэпаратаў, побач з прымяненнем раней выпрабаваных. У ВНУ працуюць брыгады урачоў з безіголкавымі ін'ектарамі.

Увесь санітарны і грамадскі актыў універсітэта павінен аказаць дзейсную дапамогу медыцынскім работнікам у правядзенні гэтага вельмі важнага прафілактычнага мерапрыемства па барацьбе з грыпам.

**Г. ЕЛІНА,**
загадчык эпідаддзела СЭС Ленінскага раёна г. Мінска.

# Аператыўна. Якасна

**АБАНЕМЕНТ НАВУКОВАЙ** і мастацкай літаратуры бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна мае навуковую, навукова-папулярную, мастацкую літаратуру на рускай, беларускай, замежнай мовах. У саставе фонду маюцца кнігі, брашуры, літаратурна-мастацкія журналы, навуковыя журналы на замежных мовах.

Абанемент абслугоўвае літаратурай звыш 13 тысяч чытачоў.

У мэтах арганізацыі аператыўнага, якаснага задавальнення запросу абанемент праводзіць з 20 кастрычніка па 20 снежня перарэгістрацыю чытачоў. Вельмі просім усіх чытачоў своечасова прайсці перарэгістрацыю.

**З. ШАЛУПЕНКА,**
галоўны бібліятэкар.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

30 кастрычніка 1980 г.

АТ 15463 Заказ 1631.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ